УДК [398.34/344+398.3]:316.7

**Ала НАРОЎСКАЯ**

*Дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.*
*Сфера навуковых інтарэсаў: этналогія і этнаграфія Беларусі, культуралогія, музеялогія і ахова гісторыка-культурнай спадчыны.*
*Аўтар дзвюх манаграфій: "Жыллё ў звычаях і абрадах беларусаў" (Мінск, 2008), "Семіётыка традыцыйнага жылля беларусаў" (Мінск, 2022); раздзелаў дзвюх калектыўных манаграфій Цэнтра даследавання беларускай культуры, мовы і літаратуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі "Нарысы гісторыі культуры Беларусі"(Мінск, 2015, 2016), больш за 50 навуковых артыкулаў.*



# Традыцыйнае жыллё беларусаў: *семіятычны аспект*

**Жыллё — адзін з сімвалаў культуры, з якім суадносяцца найважнейшыя характарыстыкі жыцця чалавека, уяўленні аб прасторы і часе, асаблівасці сацыяльнай арганізацыі, вераванняў. Высокі семіятычны статус жылля накладаў адбітак на ўсю звязаную з ім абраднасць, што праяўлялася ў складаных рытуалах. У традыцыйнай культуры, арыентаванай пераважна на рытуал, адсутнічала аднародная семіятычная сістэма, якая прызначалася для фіксацыі і захавання інфармацыі. У "вуснай культуры" прыроднаму і культурнаму асяроддзю чалавека (прадметам побыту, часткам жылля, адзенню і г. д.) надаваўся знакавы (сімвалічны) характар.**

**Ключавыя словы**: *традыцыйнае жыллё, дом, семіётыка, ідэаграма, культурная прастора, абрад*

Беларускі народ данёс да XIX ст. магічную ідэаграму, закладзеную ў аснове дома як мадэлі Сусвету. У першую чаргу выяўлялася сапраўдная інфармацыя аб месцы, на якім планавалася будаўніцва дома. Яе пошук быў заснаваны на прынцыпе мадэлявання будучага жылля на новым месцы.

Па звестках этнографа В.Багданава, беларусы на месцы будучай сядзібы чарцілі квадрат, які не павінен быў быць большы за 9 крокаў. Яго дзялілі на чатыры часткі. Пасля гэтага гаспадар сям'і ішоў *"ва ўсе чатыры бакі і прыносіў з чатырох палёў чатыры камяні, якія клалі ў цэнтры малых квадратаў"*. У выніку на месцы будучай сядзібы з'яўлялася ідэаграма ўрадлівасці, якая вядома даследчыкам пачынаючы з часоў энеаліту і якую можна сустрэць на ўзорах вышываных кашуль канца XIX — пачатку XX ст. [12, с. 42—52].

**Тэрмін "семіётыка"**, акрамя значэння "навука аб знаках", метанімічна ўжываецца таксама ў значэнні "знакавая сістэма" (напрыклад, культурная семіётыка, архітэктурная семіётыка і г. д.). Даследаванне дома як культурнага феномена адлюстроўваецца праз культурныя тэксты. Інфармацыя заўсёды захоўваецца і перадаецца з дапамогай знакаў, якія і складаюць культурны тэкст. Пры гэтым "тэкстам" называюць не толькі пісьмовыя крыніцы, але любы артэфакт, які разглядаецца як носьбіт інфармацыі.

Як адзначаў адзін з заснавальнікаў сучаснай семіётыкі Ч.Морыс, "чалавечая цывілізацыя не можа існаваць без знакаў і знакавых сістэм, чалавечы розум... інтэлект непасрэдна звязаны з функцыянаваннем знакаў" [7, с. 37—38]. Семантыка жылля звязаная з падзелам унутранай прасторы жылля на гарызантальныя і вертыкальныя часткі, надзеленыя розным сімвалічным значэннем, а таксама на больш пачэсную (покуць) і менш пачэсную (печ, "бабін" кут).

Сімвалічнай арганізацыі прасторы традыцыйнага жылля і яго семантыцы прысвечаныя работы расійскіх навукоўцаў І.Н.Гемуева, Т.Д.Скрыннікавай, Э.П.Бакаевай, М.М.Саднампілавай і інш. У сваіх даследаваннях аўтары на прыкладзе розных этнасаў прапанавалі рэканструкцыю мадэлі Сусвету, а разам з ёю — мадэлі Дома як сімвала Сусвету. Важнае значэнне для даследавання семіётыкі традыцыйнага жылля мела таксама канцэпцыя семіясферы Ю.М.Лотмана. У адпаведасці з ёй асноўнымі законамі пабудовы семіятычнай прасторы з'яўляюцца бінарнасць і, як вынік, яе неаднароднасць [6]. Жыллё мела значны ўплыў на фарміраванне бінарных апазіцый унутранае/вонкавае, свой/чужы. Адсюль чалавек выходзіў у небяспечны (чужы) свет і вяртаўся назад — у свой. Тут пачыналася і заканчвалася любое рытуальнае дзеянне. І ў гэтым сэнсе кожны чалавек разглядаў свой дом як цэнтр Сусвету.

Дзяленне квадрата крыжам заключала ў сабе касмічныя катэгорыі, якія выражаліся ў свядомасці чалавека прасторавымі і часавымі характарыстыкамі. У Віцебскай губерні існавала іншая мадэль, калі "на аблюбаваным месцы для сядзібы на сваёй "вячніні"* ці на чужынцы" гаспадар збіраў з чатырох розных палёў па адным нягладкім камені, нёс іх у шапцы на галаве ці "запазушшу" пры голым целе, клаў на выбранае месца чатырохкутнікам, бакі якога не павінны быць больш чым дзевяць крокаў, і "жызнаіць"** месца і пакладзены камень. Увайшоўшы ў сярэдзіну чатырохкутніка, трэба было пакласці шапку на зямлю і прачытаць "пацеру" (малітву) з дабаўленнем просьбы да "дзядоў" дапамагчы ў будаўніцтве "аблюбаванай сядзібы" [9, с. 134—135].

У традыцыйным жыллі беларусаў яшчэ ў канцы XIX — пачатку XX ст. можна было сустрэць пячны слуп, які ў старажытнасці размяшчаўся ў цэнтры жылога памяшкання каля печкі і быў своеасаблівым ахвярнікам і тым свяшчэнным месцам, на якое станавіўся жрэц ці іншы выканаўца абрадаў [10, с. 172]. Паступова пячны слуп змясціўся на кут печы. Жыллё служыла для чалавека ўніверсальнай кропкай адліку ў прасторы. Тут пачыналася і заканчвалася любое рытуальнае дзеянне. У гэтым сэнсе кожны чалавек успрымаў свой дом як цэнтр сусвету. Сімвалічнае атаясамліванне жылля са светам у цэлым "*відавочна абумоўлена прасторавымі ўяўленнямі, характэрнымі для міфалагічнага мыслення*" [16, с. 42]. Абараняючы чалавека ад небяспекі вонкавага, "чужога" яму свету, дом патрабаваў асаблівых да сябе адносінаў. Чалавек у доме сваімі паводзінамі зыходзіў з імкнення не парушыць даволі кволую раўнавагу паміж "сваім" і "чужым".

Надзвычай дбайна беларусы адносіліся да аховы памежнай зоны паміж жылым памяшканнем (сенцамі) і жыллём (панадворкам). Асобная роля адводзілася ахове дзвярных і аконных праёмаў на святы, паколькі на тэрыторыі Беларусі было распаўсюджана павер'е, што ў гэтыя дні нячыстая сіла можа пашкодзіць людзям. Асаблівую моц яна набывала пасля заходу сонца. Таму існавала сістэма сімвалічных спосабаў ачышчэння. Над вокнамі і дзвярыма дзеля аховы жылля ад злых духаў развешвалі крапіву і палын. Па звестках Ю.Крачкоўскага, у Брэсцкім павеце Гродзенскай губерні дзеля засцярогі над аконнымі і дзвярнымі праёмамі развешвалі сплеценыя з зёлак вянкі.

У паўднёва-заходніх раёнах Палесся і на Панямонні над дзвярыма і аконнымі вушакамі крэйдай альбо сажай ад свечкі пісалі першыя літары імён трох каралёў (К+М+В) з крыжыкамі. Адносна значэння гэтага надпісу Я.Кахновіч (1907 г. н., жыхарка в. Лядск Шчучынскага раёна Гродзенскай вобл.) патлумачыла, што такім чынам людзі адганялі нячыстую сілу [8, с. 27].

## *Семіятычныя асаблівасці вокнаў*

Нягледзячы на тое, што вокны з'яўляюцца элементам жылля, яны звязаны з катэгорыяй небяспечнага, варожага чалавеку. Таму яны надзяляюцца зместам, характэрным для аб'ектаў вонкавага свету. Згодна з этнаграфічнымі матэрыяламі праз акно адбывалася сімвалічная сувязь са светам памерлых. У пахавальнай і памінальнай абраднасці адбываецца быццам бы часовае "зняцце мяжы" (частаванне "дзядоў" на покуці, пакіданне вады на акне і г. д.). Па матэрыялах А.Сержпутоўскага, "*як толькі чалавек памрэ, хутчэй на вокны ставяць чаркі, або шклянкі з чыстаю вадою, каб душы было дзе памыцца*".

У некаторых раёнах ставілі ваду на акно і яна стаяла на працягу 40 дзён, каб душа ў цяжкі час магла зайсці пакупацца, "*каб чалавеку лягчэй было*". У некаторых мясцовасцях, калі паміраў чалавек, у акно вывешвалі ручнік як шлях, па якім павінна падымацца душа. У Драгічынскім раёне Брэсцкай вобласці, калі паміраў чалавек, тарцовае і фасаднае вокны завешвалі фартухамі, а ў Баранавіцкім раёне — посцілкай. Па звестках А.Буцэнка (1919 г. н., жыхаркі в. Боруцк Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці), "*кутнае акно напалову запіналі настольнікам, які пры пахаванні клалі ў труну*" [8, с. 31].

*Ліштва з выявамі вужоў.*
*В. Чаплічы, Лідскі раён, Гродзенская вобласць.*



*Дыялектны тэрмін "*вячніна*" (сустракаецца таксама тэрмін "*котлішча*", "*бацькаўшчына*") — месца, на якім стаяла бацькоўская хата.

**Дыялектны тэрмін "*жызнаіць*" азначае класці крыжы на выбраным месцы для ўзвядзення будучага дома. Магчыма, азначае надзяляць месца жыццём, сілаю. Тэрміны "*вячніна*" і "*жызнаіць*" былі распаўсюджаныя ў Віцебскай губерні. Цяпер сустракаецца ў в. Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобл. Па словах К.А.Панчэні (жыхаркі в. Пагост, 1941 г. н.), "*лепш было будаваць хату на бацькоўскім пляцы*". Ужываецца ў тым жа азначэнні, што і котлішча, вячніна.



*Ліштва з выявай цмока.*
*Г. Добруш, Гомельская вобласць.*



*Ліштва з выявамі жывёл. В. Навінкі, Калінкавіцкі раён, Гомельская вобласць. Фота А.Нікіціна. 2016 г.*

Продкі лічылі, што "чужы" мацней за "свайго" і валодае большай магутнасцю, г. зн. ён "чужы" і ў міфалагічным плане. І гэтага "чужога" імкнуліся зрабіць бяспечным для сваёй тэрыторыі, дома, сям'і. Так, у дзень памінання продкаў гаспадар адчыняў вокны і адтуліну ў столі ("душнік"), праз якія павінны былі прыляцець душы. Пры гэтым гаспадар запрашаў дзядоў са словамі: "*Святыя дзяды, завём вас, святыя дзяды хадзіце да нас. Ёсць тут усё, што Бог даў, што я для вас ахвяраваў, чым толькі хата багата. Святыя дзяды, просім вас, хадзіце, ляціце да нас*" [17, с. 596].

Па звестках Ю.Крачкоўскага, на вясеннія Дзяды пасля вячэры гаспадар вымятаў жыллё і выганяў такім чынам душы "*А киш, ким, душечка! Котора старша и больша та дверьми, а котора меньше, окнами*" (в. Верхавічы Слонімскага павета Гродзенскай губерні) [5, с. 122].

Асаблівую цікавасць уяўляе абрад калядавання пад вокнамі. Па ўсёй верагоднасці, яго можна суаднесці з рытуальным абменам пажаданнямі і падарункамі з прадстаўнікамі іншага свету. Паведамленні, атрыманыя праз вакно, надзяляліся спецыфічным значэннем. Як правіла, яны звязаныя з пераменамі ў жыцці чалавека, які іх пачуў. Можна прыгадаць павер'е на святкі: усё, што пачуеш пад вакном, таго і чакай. Такая маркіраванасць вербальнай сувязі праз вакно тлумачыцца тым, што традыцыйным лічыўся візуальны кантакт: у вокны глядзяць, а каля дзвярэй слухаюць.

## *Семіятычныя асаблівасці дзвярэй і парога*

Семантычна значнымі аб'ектамі ў нашых продкаў з'яўляліся дзверы і парог. Універсальнае значэнне дзвярэй тлумачыцца, хутчэй за ўсё, тым, што яны знаходзяцца на мяжы жылой і нежылой прасторы. Пры ўваходзе ў жыллё строга выконваўся шэраг этыкетных прадпісанняў. Самая простая іх інтэрпрэтацыя звязана з прасторава-часавым процістаяннем "пачатак — канец знаходжання ў жыллі". Характэрным спосабам маркіравання пачатку (уваходу) і канца (выхаду) з'яўляецца прыпынак на ганку дома, які часта суправаджаецца кароткаю малітваю і звычаем прысесці на дарогу. У сітуацыі выпраўлення ў дарогу рэгламентуюцца нават вербальныя паводзіны. М.Нікіфароўскі адзначаў, што "*апошнія словы путніка да дамачадцаў могуць быць толькі перад парогам жылля, ды з экіпажа. Перагаварывацца праз парог ці глядзець па кутах ён не павінен, таму што будуць шматлікія паломкі вупражы ды й экіпажа*".

*Сялянка прадзе кудзелю. В. Лучнікі, Слуцкі павет, Мінская вобласць. Фота І.А.Сербава. 1920—1930-я гг.*





*Сялянкі на парозе скрабуць бульбу. В. Васілевічы, Рэчыцкі павет, Гомельская вобласць. Фота 1912 г.*

Важнай была роля парога і ў этыкетных сітуацыях. Цікавыя звесткі былі зафіксаваныя ў этнаграфічных экспедыцыях Гомельскай вобласці: *"Ніколі не вітайся цераз парог, бо з тым чалавекам хутка пасварышся"*. *"Госця сустракай перад парогам і пускай наперад сябе. Праз парог рукі не падаюць"*.

Неабходна адзначыць, што ў абрадах пераходнага тыпу ўсе межы рэзка актуалізуюцца. Асабліва вызначаюцца абрады, звязаныя з парогам у радзінных і пахавальных абрадах. Калі ў першым выпадку маркіруецца пачатак жыцця чалавека, то ў другім — канец жыцця, развітанне з домам.

У абрадах уваход/выхад набываюць асаблівы сэнс. Міфалагізацыя мяжы праяўляецца ў рытуальных дзеяннях, якія суправаджаюць нараджэнне дзіцяці (адмыканне ўсіх дзвярэй, у тым ліку і "царскай брамы" ў царкве пры цяжкіх родах, пасыпанне шляху соллю каля парогу і інш.). Пры цяжкіх родах бабка-павітуха шукала шчаслівае месца, дзеля гэтага вадзіла парадзіху па розных месцах хаты, у сенцы, хлеў, гумно, адпірала ў куфарах замкі і адчыняла ўсе дзверы. А калі жанчына доўга пакутавала, то павітуха праводзіла яе тройчы цераз парог. Этнографы зафіксавалі і іншыя дзеянні: у час родаў бабка-павітуха пастуквала венікам у столь. Альбо існаваў такі звычай: у каго да нараджэння новага дзіцяці ўжо пamiралі дзеці, то, калі жанчына нараджала, выбівалі касякі з дзвярыма, а калі жанчына нараджала ў сенцах, то бабка брала дзіця і падавала яго ў хату, стоячы спінаю да дзвярэй, а той, хто прымаў дзіця ў хаце, таксама стаяў спінаю да дзвярэй.

Паводле звестак А.Семянтоўскага, у Віцебскай губерні *"пасля хрышчэння дзіця прыносіла ў хату бацькоў кума; яна клала яго каля парогу хаты, адкуль яго браў на рукі кум і, перадаючы маці, казаў: "бралі ў вас дзіця народжанае, а аддаём малітвяна і хрышчонае; дай Божа каб расло, дый шчаслівым было"* [13, с. 78]. Такім чынам, "асвяшчэнне" дзіцяці праз парог павінна было далучыць яго да дому, прынесці шчасце. З гэтым комплексам уяўленняў суадносіцца звычай пасля нараджэння дзіцяці захавання пад парогам "дзіцячага месца". Па звестках А.Дзямянчук (1908 г. н., в. Ракевічы Навагрудскага раёна) "дзіцячае месца" дзяўчынкі закопвалі ў парозе, каб хутка і шчасліва выйшла замуж, а хлопчыка — пад "покуццю", каб быў на котлішчы. Па дадзеных іншага інфарматара (1919 г. н., в. Волкавічы Навагрудскага р-на), *"дзіцячае месца", каб былі дзеці, закопвалі пад парогам ліцом. А калі жанчына не хоча больш мець дзяцей, то ніцма"* [4].

Актуалізацыя мяжы, у прыватнасці парогу, пры хваробах звязана з уяўленнямі аб лакалізацыі прычын хваробы па-за межамі дома. Напрыклад, адзін са сродкаў супраць радыкуліту заключаўся ў тым, што рубілі бярозавы венік на парозе. Пры замове вады ад болі ў страўніку ставілі ваду на парог, потым насыпалі крыж-накрыж соль і, перамешваючы нажом, казалі словы замовы. Увогуле пры лячэнні ад "сурокаў" замоўленую ваду вылівалі пад *"пяту дзвярэй"*, каб *"ліха так круцілася, як круцяцца дзверы"*.

Існаваў шэраг прадпісанняў у важныя для чалавека часы па пераходзе з "чужой" у "сваю" прастору — жыллё. Так, у вясельных абрадах існавалі пэўныя абавязковыя прадпісанні. Напрыклад, абрад пераходу цераз

парог удзельнікаў вяселля зафіксаваны ў Віцебскай губерні: згодна з этнаграфічнымі апісаннямі М.Нікіфароўскага жаніх абавязкова павінен быў прыступам узяць спачатку вароты, а потым і дзверы хаты маладой. П.Шэйн пісаў: "*У Барысаўскім павеце часам жаніха пускаюць мірам, а часам дружына жаніха выбівае дзверы хаты сілаю*" [17, с. 156].

У Пінскім павеце Мінскай губерні пры сустрэчы каля парога жаніха будучай цешчай адзін з хлопцаў з боку маладой страляў у жаніха халастымі зарадамі з ружжа. У другім апісанні з тых самых мясцін апавядаецца, што калі жаніха не ўпускаюць каравайніцы нявесты, то ён разам са сваёю дружынаю ўрываецца ў хату сілаю [1, с. 70].

Такім чынам, дом значна ўплываў на фарміраванне бінарных апазіцый "унутраны/вонкавы". Прастору за межамі дома можна разглядаць як антытэзу абжытай, упарадкаванай прасторы. Семіятычнае значэнне выхаду (уваходу) у дом вельмі вялікае. Наяўнасць дзвярэй і вокнаў — неабходная ўмова для захавання домам свайго статусу. Асаблівасць сімволікі дзвярэй і вокнаў тлумачыцца тым, што яны знаходзяцца на мяжы жылой і нежылой прасторы.

## *Семіятычныя асаблівасці покуці*

Найбольш пачэснай часткай інтэр'ера беларускага народнага жылля канца XIX — пачатку XX ст. была покуць. Семіятычная роля покуці вызначалася тым, што там захоўваліся найбольш значныя культурныя сімвалы: абразы, Біблія, малітоўныя кнігі. Высокі знакавы статус абразоў патрабаваў адпаведных паводзін чалавека ў адносінах да іх. У бажніцы асаблівае значэнне



*Покуць. В. Ісерна, Слуцкі раён, Мінская вобласць. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту.*

*Калядны інтэр'ер сялянскай хаты. В. Садавічы, Капыльскі раён, Мінская вобласць. Пачатак XX ст.*



*нараджэння закопвалі пад печчу, каб яно было пры бацьках*" [3]. З гэтай жа мэтай, "*каб дзіця любіла сваю хату і пільнавалася яе, кума ахрышчонае дзіця, як прынясе ў хату, абносіць тройчы кругом стаўпа печы, пакалыша перад чалешнікам і тады аддае маці*".

З печчу было звязана шмат іншых магічных абрадаў. Так, у в. Пагост Вілейскага раёна Мінскай вобласці павітуха з хлопчыкам на руках бралася за печку з мэтаю забяспечыць яму ў будучым здольнасць авалодаць майстэрствам печніка. А калі народзіцца дзяўчынка, "*то кума клала дзяўчынку на загнёт, каб яна "пільнавала" печы, як гэта павінна рабіць добрая гаспадыня*".

З печчу і прасторай вакол яе ў беларусаў звязана ўяўленне аб лёсе, шчасці і дабрабыце. Печ займала выключнае месца ў вясельных абрадах і звычаях беларусаў. Па звестках А.Сержпутоўскага, на Палессі "*як сваты першы раз прыдуць да дзеўкі, то яны, увайшоўшы ў хату, трохі сутрымоўваліся каля печы ды й ціхенька казалі — печ, печ памажы, — потым ужо казалі дабрыдзень, ды праходзілі да стала*" (в. Калкі) [15, с. 175]. У Нараўлянскім раёне Гомельскай вобласці, калі жаніх прыходзіў са сватам, то заставаўся стаяць каля печкі, а сват ішоў на сярэдзіну хаты і казаў: "*Мы ж не гуляць прыйшлі, а ў сваты зайшлі*". Па звычаі маладая перад гэтым лезла на печ, калі яна спускалася з печы, то гэтым выказвала сваю згоду на шлюб, гатоўнасць пакінуць бацькоўскую хату і перайсці ў дом жаніха [2].

Такім чынам, традыцыйнае жыллё з'яўляецца адным з архаічных вобразаў у свядомасці чалавека. Жыллё служыла для чалавека ўніверсальнай кропкай адліку ў прасторы. Тут пачыналася і заканчвалася жыццё чалавека, адбываліся рытуальныя дзеянні. Найбольш пачэснай часткай інтэр'ера жылля канца XIX — пачатку XX ст. была покуць. Семіятычная роля покуці падкрэслівалася тым, што там захоўваліся найбольш значныя культурныя сімвалы. З печчу і агнём як жыццёвым пачаткам было звязана ўяўленне аб лёсе і шчасці. Семіятычнае значэнне дзвярэй і вокнаў тлумачыцца, хутчэй за ўсё, тым, што яны знаходзяцца на мяжы жылой і нежылой прасторы. Даследаванне семантыкі ўнутранай прасторы жылля паказала, што яна падзялялася на правы (мужчынскі) і левы (жаночы) бок. Вертыкальнае дзяленне вызначаецца па ступені пачэснасці — ад найбольш ганаровага месца да менш пачэснага адпаведна ўзроставаму прынцыпу. Яе каштоўнасць узрастала ў кірунку да самага сакральнага месца — пад абразамі.

1. Быковский, А. Свадебные обряды и песни в Пинском уезде Минской губернии / А. Быковский // Памятная книжка Виленского генерал-губернаторства на 1868 год / под ред. А. М. Сементовского. — СПб., 1868. — С. 63—76.

2. З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Нараўлянскі р-н Гомельскай вобл. у 1981 г.

3. З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Чавускі р-н Магілёўскай вобл. у 1987 г.

4. З асабістага архіва аўтара: матэрыялы экспедыцыі БДМНАП у Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл. у 1987 г.

5. Крачковский, Ю. Ф. Быт западнорусского селянина / Ю. Ф. Крачковский. — Изд. Имп. О-ва истории древностей рос. при Моск. ун-те. — М. : Унив. тип. (Катков и К°), 1874. — 212 с. — (Чтения в Императорском Обществе истории и древностей российских при Московском университете, 1873 ; кн. 4).

6. Лотман, Ю. М. Семиосфера : сборник / Ю. М. Лотман. — СПб. : Искусство-СПБ, 2000. — 703 с.

7. Моррис, Ч. У. Основания теории знаков / Ч. У. Моррис // Семиотика: семиотика языка и литературы : [сб. ст. : пер. с англ., фр., исп.] / сост. и общ. ред. Ю. С. Степанова. — М., 1983. — С. 37—89.

8. Нароўская, А. М. Жыллё ў звычаях і абрадах беларусаў (канец XIX — пачатак XX стст.) / А. М. Нароўская. — Мінск : Рэсп. ін-т выш. шк., 2008. — 35 с.

9. Никифоровский, Н. Я. Простонародные приметы и поверья, северные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах / Н. Я. Никифоровский. — Витебск : Губерн. типолитогр., 1897. — X, 307 с.

10. Никольский, Н. М. Происхождение и история белорусской свадебной обрядности / Н. М. Никольский ; [ред.: И. Н. Лущицкий, М. Я. Гринблат, Д. А. Политыко]. — Минск : Изд-во Акад. наук БССР, 1956. — 272 с.

11. Романов, Е. Р. Белорусский сборник : [в 9 вып.] / Е. Р. Романов. — Вильно : Тип. А. Г. Сыркина, 1912. — Вып. 8 : Быт белоруса. — VIII, 600 с.

12. Рыбаков, Б. А. Язычество древних славян / Б. А. Рыбаков ; Рос. акад. наук, Отд-ние истории, Ин-т археологии. — М. : Наука, 1981. — 607 с.

13. Сементовский, А. М. Обычаи и обряды крестьян Себежского уезда при крестинах, свадьбах и похоронах / А. М. Сементовский // Памят. кн. Витеб губ. на 1865 г. — СПб., 1865. — С. 78.

14. Сербов, И. А. Белорусы-сакуны: краткий этнографический очерк / И. А. Сербов. — Петроград : Тип. Имп. Акад. наук, 1915. — [2], II, XVII, 180 с. — (Сборник Отделения русского языка и словесности Императорской Академии наук ; т. 94, № 1).

15. Сержпутоўскі, А. К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. — Менск [Мінск : б. в.], 1930. — VII, 276 с. — (Беларуская этнаграфія ў доследах і матэрыялах ; кн. 7).

16. Стеблин-Каменский, М. И. Миф / М. И. Стеблин-Каменский ; Акад. наук СССР. — Л. : Наука, Ленингр. отд-ние, 1976. — 104 с.

17, Шейн, П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края : [в 3 т.] / П. В. Шейн. — СПб. : Тим. Имп. Акад. наук, 1890. — Т. 1, ч. 2 : Бытовая и семейная жизнь белоруса в обрядах и песнях. — XXXI, 708 с. — (Сборник Отделения русского языка и словесности Императорской Академии наук ; т. 51, № 3).

*Паступіў у рэдакцыю 21.06.2022.*